**Ігнатовіч П.Р.**, *дацэнт*

# САЦЫЯЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У ГАЛІНЕ КУЛЬТУРЫ

Сярод праблем, вырашэнне якіх павінна садзейнічаць удасканаленню нашага грамадства, адно з вядучых месцаў займаюць пытанні культуры. Галоўнай сённяшняй задачай павінен стаць уздым нацыянальнай свядомасці беларускай нацыі, стварэнне ў рэспубліцы такіх умоў, пры якіх мог бы свабодна выяўляцца яе нацыянальны характар. Гэта ў сваю чаргу дазволіць прадстаўнікам іншых нацый, што жывуць на тэрыторыі Беларусі, адрадзіць нацыянальныя асаблівасці і адчуць неабходнасць у збліжэнні сваіх інтарэсаў і імкненняў.

Права грамадзян на ўдзел у культурным жыцці вызначае артыкул 51 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Гэта права забяспечваецца агульнадаступнасцю каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, якія знаходзяцца ў дзяржаўных і грамадскіх фондах, развіццём сеткі культурна-асветных устаноў. Свабода мастацкай, навуковай, тэхнічнай творчасці і выкладання гарантуецца, інтэлектуальная ўласнасць ахоўваецца законам.

Асноўныя напрамкі сацыяльнай палітыкі дзяржавы ў галіне культуры сфармуляваны ў шэрагу законаў: «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі», «Аб нацыянальным архіўным фондзе і архівах», «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» і інш.

Палітыка суверэннай дзяржавы ў галіне культуры заключаецца ў стварэнні эканамічных і арганізацыйна-прававых умоў развіцця культуры, захаванні і забеспячэнні эфектыўнай дзейнасці яе прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, падрыхтоўцы і сацыяльнай абароне работнікаў культуры, дзеячаў мастацтва, стымуляванні аматарскага руху і самадзейнай народнай творчасці.

Плённае развіццё культуры ў Беларусі ўключае вырашэнне наступных задач:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- дэмакратызацыя кіравання культурай, умацаванне самадзейных асноў у культурнай дзейнасці;

- пераемнасць і непарыўнасць традыцый, апора на фундаментальныя агульначалавечыя каштоўнасці, культурную і гістарычную спадчыну нашага народа;

- стварэнне ўмоў для захавання і папулярызацыі скарбаў беларускай нацыянальнай спадчыны;

- раўнапраўнае развіццё культур прадстаўнікоў іншых этнасаў,якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі;

- гуманізацыя, узмацненне асобаснага зместу сацыяльнай і культурнай дзейнасці;

- лепшае навуковае і кадравае забеспячэнне беларускай культуры, навуковая распрацоўка праблем яе развіцця;

- устанаўленне і развіццё шырокіх знешніх культурных сувязей Беларусі з замежнымі партнёрамі;

- пастаянная работа навуковых і навучальных устаноў, творчых саюзаў і аб'яднанняў па прагназіраванню развіцця беларускай культуры.

Але распрацоўка і ажыццяўленне культурнай палітыкі носяць супярэчлівы характар. З аднаго боку, як было паказана вышэй, у асноўных дакументах дэкларуюцца задачы стварэння юрыдычных, матэрыяльна-тэхнічных і фінансавых умоў для развіцця нацыянальнай культуры. Шмат чаго робіцца і на практыцы. У той жа час многае ў культуры прыходзіць у заняпад, закрываюцца ўстановы культуры, скарачаюцца штаты, дзяржаўнае фінансаванне недастатковае, ведамствы і прафсаюзы ў большасці сваёй наогул перасталі фінансаваць культуру.

На сучасным этапе інтэнсіўна ідуць працэсы пранікнення праз усе сродкі не лепшых узораў масавай культуры. Павялічваецца адарванасць людзей, асабліва моладзі, ад каштоўнасцей класічнай літаратуры, музыкі, выяўленчага мастацтва. Адбываецца камерцыялізацыя працэсу стварэння і распаўсюджвання духоўных каштоўнасцей. Звужаецца сфера культурна-творчай дзейнасці і ўмацоўваецца арыентацыя на спажыванне гатовай прадукцыі культуры. Адбываецца зніжэнне ўзроўню ведаў, агульнай адукаванасці, выхаванасці, маральнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ